Да 75-годдзя вызвалення 1944 2019

# ...ТЫМ БЛІЖЭЙ ГІСТОРЫЯ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар).*

Гэта не здымкі мастацкага фільма ці дакументальнай перадачы, а адзіны ў краіне мемарыяльны комплекс партызанскай славы «Хаваншчына» ў Івацэвіцкім раёне. Калісьці тут сапраўды жыла «лясная армія» і знаходзіўся сямейны лагер. Падчас вайны ніводны немец так і не змог трапіць на загадкавы востраў сярод балот. Аднак людзі нават праз сем з паловай дзесяцігоддзяў пасля вызвалення Беларусі не забылі сцяжынку на Хаваншчыну. Кожны год на некалькі дзён гэтыя мясціны ажываюць у прамым сэнсе. Дзясяткі рэканструктараў з Беларусі і Расіі прыязджаюць сюды, каб пераночыць у рэальных партызанскіх умовах — без святла, цёплых ложкаў і хатняй ежы. А таксама каб зладзіць для публікі эфектнае відовішча барацьбы простага народа з захопнікамі-агрэсарамі.

Пачынальнік адраджэння партызанскага руху на Хаваншчыне ў тым фармаце, які існуе цяпер, — карэспандэнт брэсцкай абласной газеты «Заря» і заўзяты рэканструктар Алег Грабеннікаў. Ён жа стаяў каля вытокаў правядзення начных рэканструкцый у Брэсцкай крэпасці.

— Колькі сябе помню, вельмі любіў ваенную гісторыю. Рэч нават не ў тым, што я 23 гады служыў ва Узброеных сілах Беларусі. Проста захапляўся ўніфармістыкай і мініяцюрамі, а неяк 22 чэрвеня прыйшоў у нашу крэпасць у форме лейтэнанта Чырвонай арміі. Захацелася аддаць даніну памяці тым, хто першымі прыняў варожы ўдар. Так пачыналася рэканструктарская дзейнасць у Брэсце, якая цяпер пашырылася і на ўсю вобласць, — кажа Алег. — Гэта не гульня дарослых людзей у «вайнушку». Хочацца хоць на тысячную долю адчуць сябе на месцы нашых дзядоў. Нават калі бярэш умоўную вышыню і страляеш халастымі кулямі, хвалюешся і баішся вайны. Дарэчы, многія гледачы паказальных баёў не здагадваюцца, што самыя «жорсткія» рэканструктарскія сутычкі прайшлі напярэдадні. Мы ж недарма прыязджаем у партызанскі лагер на некалькі дзён.

Фронтлайн (або тактыка) — так называюцца мерапрыемствы, дзе рэканструктары разгортваюць імітацыю вайны ў максімальна набліжаных да рэальнасці ўмовах. Месца дзеяння — не маленькі поплаў, а навакольны лес. Вялікі, непраходны, з топкімі балотамі.

— У агавораны час перамір'е паміж «немцамі» і «партызанамі» скончылася і пачалася ўмоўная вайна. Проста так трапіць з аднаго лагера ў другі стала немагчыма. Ніякіх сцэнарыяў ужо няма. Спецгрупы «лясной арміі» атрымалі заданні — імітаваць падрыў моста, разгарнуць радыёстанцыю ў пэўным квадраце і перадаць радыёграму і г. д. Зрабіць гэта трэба было так, каб цябе не заўважылі «немцы», інакш аперацыю можна лічыць праваленай.

Давялося рэканструктарам і па пояс у вадзе пахадзіць, і мясцовых камароў сваёй кроўю напаіць, і ўсіх навакольных зайцоў ды ліс халастымі стрэламі распужаць. Але ж колькі ўражанняў!

### Жыццё на фоне вайны

Пасля начных баёў абодва бакі вярнуліся да часовага перамір'я. Менавіта ў ранішні час цікава паназіраць за «побытам пад дрэвамі» і бліжэй пазнаёміцца з рэканструктарамі.

«Немцы» разбілі лагер на самым ускрайку леса. Прасторныя палаткі, гучны смех, у кустах блішчыць матацыкл BMW. «Падыходзь, не саромейся. Усе свае», — чуць гэта ад людзей у форме вермахта дзіўна.

— Але ж гэта толькі абмундзіраванне. Арганізатары папрасілі прыехаць у вобразе немцаў — мы прыехалі. Трэба, каб чырвонаармейцаў было больш — з задавальненнем рэканструявалі б іх. Палітыка і ідэалогія ў нашым асяродку нават не абмяркоўваюцца, — дзеліцца Павел Рошчын з Віцебска. — А форма ў нямецкіх салдат таго перыяду сапраўды прыгожая і практычная, мае шмат дэкаратыўных элементаў. Вялікая розніца з нашымі салдатамі адчуваецца і ў плане побыту. Умоўна кажучы, адкрывае немец сумку, а там, акрамя лыжкі, ёсць яшчэ і відэлец, ручнік, набор для галення, люстэрка і нават крэм Nivea. У чырвонаармейцаў камплекты былі больш сціплыя.

У першых сонечных промнях, якія ледзь-ледзь прабіваюцца праз кроны дрэў, снедаюць дзве фрау. Гарбата ў фарфоравых кубках, да яе — печыва і бутэрброды. Маладыя жанчыны сядзяць за невялічкім столікам, быццам не ў лесе, а на тэрасе кафэ. «Guten Morgen!» — кажуць яны мне і запрашаюць далучыцца. «Немкі» аказваюцца мінчанкамі. Наталля і Таццяна — удзельніцы ваенна-гістарычнага клуба «Мядзведзіца».

— Сёння прадстаўляем паліцыю вермахта, якая прыбыла на дапамогу сваім Kameraden (з нямецкай таварышы. — **Аўт.**) для падтрымання парадку. Жанчын на нямецкім баку падчас вайны было шмат, хоць іх рэдка можна ўбачыць у кіно. Яны выконвалі функцыі стэнаграфістак, запаўнялі дакументы, вялі архівы. Вядома, даводзілася жыць у палявых умовах. Палаткі збіраліся з кавалкаў плашчоўкі, якую меў пры сабе кожны салдат. Зверху каска, каб вада не зацякала. Унутры — аўтэнтычныя раскладушкі з бялізнай накшталт той, што была распаўсюджана ў Германіі ў саракавых. На вяроўцы вы бачыце адзенне, у якім мы ўчора абсталёўвалі свой лагер. Так, асобная рабочая форма!

Калі «немцы» занялі пазіцыі на вачах ва ўсіх, то да «нашых» паспрабуй яшчэ дайдзі. Але на тое яна і Хаваншчына, каб у самай глыбіні, на востраве сярод балот, партызаны хаваліся. Побыт і адзенне прасцейшыя, затое ніякіх тлумачэнняў не патрабуюць. Тут — зямлянка, там — драўляныя хаткі-зрубы. А між імі снуюць туды-сюды барадатыя хлопцы ў льняных кашулях і залатанай чырвонаармейскай форме. Ды і ежа няхітрая. Пыхціць самавар: у алюмініевую пасудзіну наліваюць гарачага адвару з лясной травы. Каштую фірменную страву ад кухараў — аладкі з крапівы. Дарэчы, пякуцца не на вогнішчы, а на так званай фінскай печы (расколатае бервяно з агнём унутры).

Маю ўвагу прыцягвае мужчына ў кепцы, па-хуліганску ссунутай набок. У руках — шпагат, шчыпчыкі і загадкавыя белыя брыкеты. Гэта «падрыўнік» (у рэальным жыцці архітэктар) Аляксандр Сіманаў з Брэста. Разам з калегамі ён паказвае маленькім турыстам Хаваншчыны, як вялася рэйкавая вайна. Без асаблівых падрабязнасцяў, канешне. Затое гучна і з пясчанымі салютамі.





— Найвышэйшым пілатажам лічылася пусціць пад адкос эшалон. Але зрабіць гэта было няпроста. Немцы спачатку прадбачліва накіроўвалі паравоз з сапёрнай групай, якая правярала чыгунку. Праз 15 хвілін ішлі цягнікі з жывой сілай і тэхнікай. Партызанам трэба было за кароткі прамежак часу падкласці ўзрыўчатку, прытым што ўздоўж дарогі стаялі блокпасты, а лес навокал быў высечаны, — дае невялікі экскурс у гісторыю Аляксандр.

Сакрэтамі рэканструктарскай справы падзяліўся Арцём Быкаў.

— Не заўсёды добрыя рэканструктары — тыя, хто служыў. Вопыт сучаснай арміі можа нават нашкодзіць. Хлопцы пасля службы часта выходзяць на поле са свабодным рэменем. Дэмбельскі гонар не дазваляе зацягнуць яго! У Чырвонай арміі вельмі строга за знешнім выглядам сачылі. Байцы маглі быць апрануты ў гімнасцёркі на тры памеры большыя, чым трэба, але выглядалі акуратна. Розныя былі і вітанні. Тады камандзіру хорам выкрыквалі: «Здрасте!» А ўчарашнія салдаты па армейскай звычцы пачынаюць: «Здравия желаем, товарищ...» Хоць, вядома, не толькі дзеля больш глыбокага ведання гісторыі народ пачынае займацца рэканструкцыямі. Мы тут збольшага людзі гарадскія, разбэшчаныя цывілізацыяй і камфортам. А выезды ў лес — гэта шмат у чым яшчэ і праверка сябе самога.

— Прагучыць банальна, але хачацца даказаць, што магу, — далучаецца да Арцёма таварыш па атрадзе «радыстка» Ганна Кароза. — Магу выкапаць акоп і прасядзець у ім цэлы дзень, магу перагночыць на снезе, магу праехаць дзясяткі кіламетраў верхам на кані... Бывалі моманты, калі хацелася ўсё кінуць і сказаць «Стоп!» Тады ўспаміnala тых, хто і не такое падчас вайны перажыў, і спакойна працягвала выконваць пастаўленую задачу.

* * *

Перад самым адыходам з лагера знаёмлюся з жыхаром Івацэвіч Аляксандрам Германам. Ён не рэканструктар, але на Хаваншчыну прыязджае ўсё жыццё.

— Бацькі мае ў гэтых лясах партызанілі. Мама была сувязной. А бацька, калі яго адпраўлялі на прымусовыя працы ў Германію, збег у Харошчыцы і далучыўся да тамтэйшага атрада. Падарваў сем варожых эшалонаў і быў у коннай разведцы. На Хаваншчыне ён маму і сустрэў. Калі вайна скончылася, усе мясцовыя партызаны пакляліся, што будуць збірацца тут штогод у апошнія выхадныя мая. Былі жывыя — ні разу сваім абяцанням не здрадзілі. А цяпер мы, іх дзеці і ўнукі, працягваем традыцыю...

**Ганна КУРАК, фота аўтара.**

# ПАРТЫЗАНЫ, КРОКАМ РУШ!

**У лапцях і са зброяй «лясная армія» прайшлася па мінскіх вуліцах у мінулую суботу.**

...Ліпень сорак чацвёртага. У сталіцу Беларусі з жорсткімі кровапралітнымі баямі ўварваліся часці 1-га і 3-га Беларускіх франтоў. Аднак кропку ў барацьбе за горад гэта не паставіла. Штаб партызанскага руху адпраўляе ў злучэнні радыяграмы з загадам прыбыць у Мінск. Народныя мсціўцы павінны былі абараняць вуліцы, займацца канвоем палонных і пачынаць падрыхтоўку да расфарміравання ўласных атрадаў і брыгад. Дакладна вядома, што баі ў лясах на ўсход ад горада працягваліся акурат да 11 ліпеня. А ўжо 15-га было прынята рашэнне правесці святочны мітынг і парад партызан. Месцам дзеяння абралі іпадром на Чырвонаармейскай, на якім загадзя папрацавалі сапёры (па ўсім горадзе яшчэ заставалася шмат мін).

Хто крочыў на парадзе? Брыгады Мінскай, Баранавіцкай, Вілейскай і Магілёўскай абласцей. Разведчыкі, падрыўнікі, кулямётчыкі, сувязныя — каля 30 тысяч схуднелых і стомленых беларусаў нарэшце выйшлі з цёмных лясоў і вільготных балот. Дарэчы, перад пачаткам свята многім з іх уручылі заслужаны медаль «Партызану Айчыннай вайны». Побач па іпадроме прайшліся байцы і камандзіры Чырвонай Арміі разам з галоўнакамандуючым Трэцім Беларускім фронтам І. Д. Чарняхоўскім, а таксама дэлегацыя з горада Горкага (цяпер Ніжні Ноўгарад). Самым незвычайным удзельнікам стаў... казёл з мянушкай Малыш. Ён быў сапраўдным партызанам: удзельнічаў ва ўсіх баявых аперацыях атрада «Барацьба» брыгады «Народныя мсціўцы» — хадзіў за санінструктарам і пераносіў сумку з медыкаментамі...

У наш час маштабную рэканструкцыю парада партызан зладзіла Мінская гарадская арганізацыя БРСМ. Да ўдзелу запрасілі як актывістаў маладзёжнага руху сталіцы, так і заўзятых рэканструктараў з усёй краіны. Калона з конніцай, партызанамі і падпольшчыкамі, байцамі Чырвонай арміі прайшла па Камсамольскай вуліцы.

— Беларусь — партызанская рэспубліка. А гэты парад — унікальнае мерапрыемства не толькі для Мінска, але і для ўсяго свету. Адных слоў мала, гэта трэба яшчэ і паказваць. У першую чаргу самім беларусам, маладому пакаленню, — выказаў думку камандзір падраздзялення Чырвонай арміі ваенна-рэканструктарскага клуба «Эпоха» Вячаслаў Каптур.

Пасля ўрачыстай часткі свята працягнулася ў скверы. Танцы пад гармонік, лясныя пачастункі і размовы пра баявое мінулае дзядоў і прадзедаў.

— Шмат старонак гісторыі Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі незаслужана адыходзяць у нябыт. Задача рэканструктараў — не дапусціць бяспамяцтва нашчадкаў. Франтавікі, партызаны і падпольшчыкі, працаўнікі тылу — усе яны былі жывымі людзьмі, нашымі з вамі папярэднікамі, — упэўнены кіраўнік гомельскага ваенна-патрыятычнага мотаклуба «Штрафбат» Віталь Мядзведзеў. — Мала хто ведае, што Рагачоўшчына, дзе падчас акупацыі разгарнуўся моцны партызанскі супраціў, была вызваленая дзякуючы штрафнікам. Генерал Ракасоўскі даў загад 8-му асобнаму штрафному батальёну (які складаўся з афіцэраў) сысці ў тыл ворага і ўдарыць па Рагачове адтуль. Такім чынам было забяспечана паспяховае вызваленне горада. Усе штрафнікі за гэты подзвіг былі адноўлены ў званнях. Гэта ўнікальны выпадак у гісторыі вайны.

**Ганна КУРАК.**

Вызваліцелі

# ЯМУ ЎДЗЯЧНЫЯ ВЯЗНІ АЗАРЫЧ

## ...а таксама жыхары Рэчыцы, Бабруйска, Нясвіжа і Баранавіч

**Наш сённяшні матэрыял мы прысвячаем светлай памяці аднаго з самых таленавітых савецкіх палкаводцаў, двойчы Героя Савецкага Саюза, генерала арміі Паўла Іванавіча Батава. Аўтар гэтых радкоў ганарыцца, што яму ў свой час удалося сустрэцца ў Мінску з праслаўленым палкаводцам і ўзяць у яго інтэрв'ю. Мы акцэнтуем увагу на ўдзеле 65-й арміі і яе камандуючага ў вызваленні Беларусі ў 1943—1944 гадах.**



### УДАЛЫ МАНЕЎР НА ДНЯПРЫ

...Восенню 1943 года пад магутным націскам часцей Цэнтральнага фронту войскі вермахта адкочваліся да так званага Усходняга вала. На гэтым рубяжы, які працягнуўся па Дняпры і Сожы да Гомеля і далей на поўнач, Гітлер разлічваў стабілізаваць фронт і перайсці да пазіцыйнай вайны.

65-я армія ва ўзаемадзеянні з 48-й арміяй пасля фарсіравання Дзясны вяла баі на гомельскім напрамку. Наяўнасць лясных масіваў і мноства балот прывялі да таго, што злучэнні Цэнтральнага фронту аказаліся заціснутыя ў вузкім калідоры і былі пазбаўленыя магчымасцяў манеўру. Тэмп наступлення пачаў зніжацца. Толькі да канца верасня 1943 года войскі выйшлі да ракі Сож на поўдзень ад Гомеля на рубяжы населеных пунктаў Фёдараўка—Шарпілаўка—Суслаўка. Увечары 28 верасня 19-ы стралковы корпус 65-й арміі з ходу пачаў фарсіраванне ракі каля вёскі Нова-Цярэшкавічы. На процілеглым беразе абаранялася 6-я нямецкая дывізія, якая мела вялікія сродкі ўзмацнення.

У кастрычніку 1943 года 65-я армія ва ўзаемадзеянні з 61-й арміяй генерала Бялова фарсіравала раку Днепр і захапіла плацдарм у раёне Лоева. Сам гарадскі пасёлак Лоеў быў вызвалены 17 кастрычніка 1943 года.

За ўмелае кіраўніцтва войскамі 65-й арміі пры фарсіраванні Дняпра, захоп і ўтрыманне плацдарма на яго правым беразе і праяўленыя пры гэтым мужнасць і адвагу на беларускай зямлі 30 кастрычніка 1943 года генерал-лейтэнанту Батаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У Гомельска-Рэчыцкай наступальнай аперацыі войскі 65-й арміі ва ўзаемадзеянні з 1-м гвардзейскім танкавым корпусам і 48-й арміяй у снежні 1943 года вызвалілі Рэчыцу і Рэчыцкі раён. У разгар баёў — 20 кастрычніка 1943 года — Цэнтральны фронт быў перайменаваны ў Беларускі фронт, што, па словах П. І. Батава, азначала, што Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання нацэліла воінскія часці гэтага фронту на вызваленне Беларускай ССР. Цікава, што Рэчыца не ўваходзіла ў паласу наступлення 65-й арміі. Але стварылася спрыяльнае становішча для глыбокага манеўру і ўдару па горадзе з тылу, бо корпус Самарскага здолеў ужо перавесці праз Днепр усе свае дывізіі. Упусціць такую магчымасць было б недаравальна.

### «УСЕ СІЛЫ БЫЛІ КІНУТЫЯ, КАБ ЛІКВІДАВАЦЬ ЭПІДЭМІЮ»

У студзені-лютым 1944 года цягам Калінкавіцка-Мазырскай наступальнай аперацыі воіны 65-й арміі ва ўзаемадзеянні з 61-й арміяй нанеслі паражэнне сапернікў ў раёне Азарыч і палепшылі сваё аператыўнае становішча.

Аўтар гэтага матэрыялу давялося неаднаразова сустракацца з вязнямі Азарыцкіх лагераў смерці, якія цудам выжылі. У размове яны з удзячнасцю ўспаміналі сваіх вызваліцеляў і выратавальнікаў — воінаў 65-й арміі і яе камандуючага — генерала Паўла Батава.

Сёння ёсць магчымасць азнаёміцца з матэрыялам «Азарыцкія лагеры смерці ў Вялікую Айчынную вайну», змешчаным у першым томе «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» (Мінск, 1993). У ім ёсць такія радкі:

*«Створаны ням.-фаш. захопнікамі ў пач. 1944 у былым Дамanавіцкім р-не. Пад выглядам эвакуацыі больш за 50 тыс. непрацаздольных сав. грамадзян былі прывезены ў 3 лагеры смерці, створаныя недалёка ад пярэдняга краю абароны, каля г. п. Азарычы, в. Дзерць і Падасіннік. Зняволеных трымалі на адкрытых балоцістых мясцінах, без пабудоў. Вакол тэрыторыі, абгароджанай калючым дротам, былі пастаўлены кулямётныя вышкі, падыходы замініраваны. Гітлераўцы размясцілі сярод вязняў сыпнатыфозных хворых з мэтай распаўсюдзіць эпідэмію сярод наступаючых часцей Чырвонай Арміі. Вязняў марылі голадам, забаранялі раскладаць агонь, яны вымушаны былі піць балотную ваду. За пратэст — расстрэльвалі. Да вызвалення 18—19.03.1944 у жывых засталося 33 480 чал, з іх дзяцей да 13 гадоў 15 960, жанчын 13 072, старых 4448».*

Асноўным недахопам гэтага матэрыялу з'яўляецца адсутнасць згадкі пра тое, што вязні Азарыцкіх лагераў смерці выратаваліся дзякуючы воінам 37-й гвардзейскай дывізіі пад камандаваннем генерала Ушакова з 65-й арміі пад камандаваннем генерала Батава.

Праз шмат гадоў Павел Іванавіч успамінаў:

*«Усе сілы былі кінутыя, каб ліквідаваць эпідэмію. Радзецкі (член Ваеннага савета 65-й армии — Э. І.) цалкам узяў справу ў свае рукі. 25 шпіталяў аддадзена пад хворых на тыф. Трэба аддаць належнае ўрачам. Яны сустрэлі ворага ў поўным узбраенні, хоць практыкі барацьбы з эпідэміяй сыпняку не было — наша краіна даўно ліквідавала сыпняк, халеру і іншыя хваробы, якія калісьці «касілі» народ.*

*У штаб фронту паслана дэпеша. Адказ: у раён бедства выязджае прадстаўнік урада Беларускай ССР Н. Р. Грэкава з задачай арганізаваць дапамогу грамадзянскаму насельніцтву. З Надзеяй Рыгораўнай мне даводзілася сустракацца, бо яна была жонкай начальніка штаба фронту (Малініна. — Э. І.). Энергічная, самаахвярная жанчына. Пад яе кіраўніцтвам знаходзілася эвакуацыя вызваленых з лагераў, арганізаваная медыцынская дапамога ў раёне...*

*Корпус Самарскага з прычыны эпідэміі давялося вывесці часова ў другі эшалон. Хваробу спынілі».*

7 красавіка 1944 года ўрад і ЦК Кампартыі Беларусі звярнуліся да камандзіраў 65-й арміі з такімі словамі: *«Урад Беларускай ССР і ЦК КП(б) Беларусі ў Вашай асобе выносяць падзяку радавому, сяржанцкаму, афіцэрскаму складу і генералам 65-й арміі за вызваленне 33 тысяч чалавек мірнага беларускага насельніцтва з нямецкіх канцэнтрацыйных лагераў і выратавання іх ад смерці. Ваша дапамога вызваленаму насельніцтву харчаваннем, абмундзіраваннем, клопат па размяшчэнні і медыцынскім абслугоўванні сведчаць пра глыбокую і непарыўную сувязь гераічнай Чырвонай Арміі з савецкім народам».*

### АД БЯРЭЗІНЫ ДА ВІСЛЫ

У чэрвені—жніўні 1944 года 65-я армія ў складзе 1-га Беларускага фронту ўдзельнічала ў аперацыі «Баграціён». У Бабруйскай аперацыі яе злучэнні сумесна з 48-й і іншымі арміямі фронту акружылі і разграмілі 40-тысячную групоўку 9-й нямецкай арміі, вызвалілі гарады Асіповічы і Бабруйск.

У дзень вызвалення Бабруйска ад нямецкіх акупантаў — 29 чэрвеня 1944 года — Паўлу Іванавічу было прысвоена званне генерал-палкоўніка.

З імем камандарма-65 Батава звязана таксама вызваленне Слуцка — 30 чэрвеня і Нясвіжа — 2 ліпеня 1944 года.

Упершыню ўжыўшы для артылерыйскай падтрымкі пяхоты і танкаў двайны агнявы вал, развіваючы наступленне на баранавіцкім напрамку, 65-я армія ва ўзаемадзеянні з 48-й і 28-й арміямі нанесла паражэнне часцям групы армій «Цэнтр» і вызваліла 8 ліпеня 1944 года горад Баранавічы.

У ходзе наступлення часці 65-й арміі фарсіравалі раку Шчара. Ва ўзаемадзеянні з 1-м гвардзейскім танкавым корпусам і франтавой конна-механізаванай групай яны занялі горад Слонім і ў сярэдзіне ліпеня 1944 года выйшлі на рубеж Свіслач — Пружаны. У Люблін-Брэсцкай аперацыі 65-я армія сумесна з 48-й і 28-й арміямі разбіла асноўныя сілы 2-й нямецкай арміі на поўнач ад горада Брэста і ў жніўні фарсіравала раку Заходні Буг.

За ўзорнае кіраўніцтва войскамі 65-й арміі ў Беларускай наступальнай аперацыі, пры фарсіраванні ракі Вісла, за паспяховы штурм горада Данцыга і авалоданне горадам Штэцін Павел Іванавіч Батаў 2 чэрвеня 1945 года быў узнагароджаны другім медалём «Залатая Зорка».

Цікава, што баявыя поспехі 65-й арміі пад камандаваннем П. І. Батава 23 разы адзначаліся ў загадах Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Сталіна.

### РУКА АБ РУКУ З ПАРТЫЗАНАМІ

Не буду пераказваць усё інтэрв'ю аўтара гэтых радкоў з Паўлам Батавым. Мяне, у прыватнасці, цікавіла ўзаемадзеянне камандавання 65-й арміі з беларускімі партызанамі ў ходзе вызвалення Беларусі ў 1943—1944 гадах.

Вось што адказаў Павел Іванавіч на маё пытанне:

*«Не магу забыць, што з пачатку снежня 1943 г. паміж нямецкімі апорнымі пунктамі Парычы і Азарычы існавалі так званыя «партызанскія вароты». Менавіта праз гэты пралом мы перакідалі партызанам зброю, боепрыпасы, радыёапаратуру і нават пошту, а з акупаванай немцамі тэрыторыі ў нашу армію прыбывала людское папаўненне.*

*У снежні 1943 года па ініцыятыве Мінскага падпольнага абкама партыі на працягу некалькіх дзён у нашу армію ўступіла больш за дзесяць тысяч добраахвотнікаў з Любанскага, Старадарожскага, Слуцкага, Капыльскага, Старобінскага і Чырвонаслабодскага раёнаў.*

*Амаль тры месяцы ў нямецкім тыле разам з беларускімі партызанамі дзейнічаў зводны атрад нашага войска, створаны на базе 1-га батальёна 1281-га палка, які трапіў у акружэнне 20 снежня 1943 года, або, як яго часам называлі, «зводны полк» 65-й арміі на чале з будучым палкоўнікам Навумам Язэпавічам Фрэнкелем. Ён удзельнічаў у партызанскіх рэйдах, нападах на нямецкія гарнізоны і апорныя пункты сумесна з беларускімі партызанскімі брыгадамі.*

*Падчас аперацыі «Баграціён» воінам нашай арміі давялося неаднаразова дзейнічаць разам з Мінскім партызанскім злучэннем пад камандаваннем Героя Савецкага Саюза, генерал-маёра Васіля Казлова. Партызаны брыгад Міншчыны забяспечвалі нас інфармацыяй аб нямецкіх часцях, здзяйснялі дыверсіі ў іх тыле і такім чынам палягчалі выкананне задач часцей 65-й арміі.*

*Калі вызваленне Беларусі ад нямецкіх акупантаў падыходзіла да канца, у нашу 65-ю армію ўлілося некалькі тысяч беларускіх партызан. Гэта былі смелыя і адважныя воіны. Многія з іх прайшлі разам з намі шлях да Вялікай Перамогі і прымножылі славу нашай арміі».*

### ПАМЯЦЬ ПРА ГЕРОЯ

Пасля вайны П. І. Батаў паспяхова працягнуў ваенную кар'еру.

У 1955 годзе Паўлу Іванавічу прысвоілі званне генерала арміі.

Ваенны талент Паўла Батава высока ацэньвалі многія выбітныя савецкія палкаводцы, у тым ліку маршалы Жукаў, Ракасоўскі, Васілеўскі.

Сярод урадавых узнагарод Паўла Іванавіча — пяць палкаводніцкіх ордэнаў (тры ордэны Суворава 1-й ступені, ордэны Кутузава 1-й ступені і Багдана Хмяльніцкага 1-й ступені), восем ордэнаў Леніна, тры ордэны Чырвонага Сцяга, ордэн Айчыннай вайны 1-й ступені, іншыя ордэны, шматлікія медалі, 11 замежных ордэнаў.

Павел Батаў быў ганаровым грамадзянінам Бабруйска, Лоева, Рэчыцы, Калінкавіч, Светлагорска.

Паўла Іванавіча не стала 19 красавіка 1985 года — на 88-м годзе жыцця.

Беларускі народ захоўвае ўдзячную памяць пра аднаго з самых таленавітых савецкіх палкаводцаў і па праве называе яго адным з першых вызваліцеляў Беларусі ад нямецкіх акупантаў. Бюст Паўла Батава ўстаноўлены ў Гомелі. Яго імем названы вуліцы ў Бабруйску, Калінкавічах, Светлагорску, сярэдняя школа № 4 у Слоніме.

**Эмануіл ІОФЕ, доктар гістарычных навук.**

# МАЗАІКА ПАМЯЦІ

**У межах рэспубліканскай акцыі «Беларусь памятае» грамадскія арганізацыі і ўстановы распачалі шэраг новых праектаў.**

Так, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі сумесна з піянерскай арганізацыяй запусціў маштабную акцыю — па ўсёй Беларусі збіраюцца фатаграфіі ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, запісваюцца гісторыі, вядзецца пошукавая работа. Сабраныя звесткі ўвойдуць у альбом «Беларусь памятае», які перададуць Беларускаму дзяржаўнаму музею гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. 11 чэрвеня актывісты распачнуць маладзёжны марафон «75», падчас якога ў розных гарадах Беларусі будуць збірацца матэрыялы пра герояў вайны. Па краіне будзе падарожнічаць маленькая лабараторыя з абсталяваннем, неабходным для падрыхтоўкі альбома. Сюды маладыя людзі, якія хочуць, каб памяць пра іх прадзедаў не знікла, змогуць прынесці на сканаванне старыя фатаграфіі. Таксама ў патрыятычным падарожжы будуць збірацца рэгіянальныя палотны, якія складуцца ў сцяг памерам 6 на 12 метраў. З ім актывісты прымуць удзел ва ўрачыстасцях 3 ліпеня.

Таксама БРСМ праводзіць фотаконкурс, куды можна дасылаць фатаграфіі, якія сведчаць пра тое, што сучаснае пакаленне шануе гісторыю і памяць пра сваіх продкаў. На конкурс можна дасылаць не толькі фотапартрэты ветэранаў і іх нашчадкаў, але і здымкі, якія раскажуць пра святы Перамогі, пра манументы, пра ўзнагароды і рэчы, якія захоўвалі ветэраны і іх сем'і.

Шэраг мерапрыемстваў, прымеркаваных да 75-годдзя вызвалення Беларусі, праводзяць прафсаюзы. Самыя маштабныя з іх звязаны з Курганам Славы, над якім шэфствуе арганізацыя. Як паведаміў **начальнік галоўнага ўпраўлення па культуры і грамадскай рабоце апарата Маладзёжнага Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Арцём ІГНАЦЕНКА,** сёлета тут будзе ўстаноўлены штурмавік Іл-2. Каб аднавіць мадэль часоў Вялікай Айчыннай вайны, выкарыстаны дэталі ад самалётаў, знойдзеныя падчас раскопак у розных гарадах Расіі. Прэзентаваць адрэстаўраваны самалёт будуць 5 ліпеня, у гэты дзень якраз споўніцца 50 гадоў з моманту адкрыцця Кургана Славы. Арганізатары запрашаюць на тэатралізаваную пастаноўку «Крылы Перамогі» і вячэрні канцэрт.

Міжнародныя сустрэчы, канферэнцыі, часовыя экспазіцыі, аблічбоўка партызанскіх рукапісаў, патрыятычныя экскурсіі для дзяцей, нясумныя музейныя заняткі — усё гэта мерапрыемствы Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, скіраваныя на захаванне памяці. Сёлета ўстанова апрабавала і новую форму работы — анлайн-урокі па ваеннай гісторыі. Падчас школьных заняткаў для дзяцей з магілёўскага ліцэя праз інтэрнэт вялася трансляцыя лекцый і відэаматэрыялаў з музея. Супрацоўнікі падбіралі матэрыялы ў адпаведнасці са школьнай праграмай — разглядаліся тэмы, заяўленыя ў экзаменацыйных білетах. Эксперымент прайшоў удала, і ў будучыні падобныя відэаўрокі можна запускаць і ў іншых беларускіх школах. Для дзяцей і настаўнікаў, якія жывуць далёка ад сталіцы, гэта выдатная магчымасць пазнаёміцца з экспазіцыяй музея дыстанцыйна.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**